CORE
Metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
Provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

**«ИМЕНИННИЦА»**, апавяданне Б. на рус. мове. Датуецца 1914. Твор прысвечаны падзеям 1-й сусв. вайны. Назва адразу згадвае пра той вял. кантраст, які стаў асновай новага жыцця і быў выразна бачным паэту: паміж святам і бядой, нараджэннем і смерцю, каханнем і забойствам, марай і рэчаіснасцю. Б. у апавяданні ад 1-й асобы ўзнаўляе сітуацыю, якая магла быць рэальнай ужо ў самым пач. вайны: госці, сярод якіх апавядальнік, святкуюць дзень нараджэння Надзенькі, жаніх якой зусім нядаўна трапіў на фронт. Кожны дзень нявеста чытае газеты, дзе пералічаны прозвішчы тых, хто загінуў. Апавядальніку падчас свята стала вядома пра смерць Жоржа, але ніхто не сказаў імянінніцы пра звесткі ў газеце. У апавяданні Б. узнавіў праблемы, якія стануць скразнымі ў еўрап. л-ры пра вайну ў 1920-я гг. (творы прадстаўнікоў «страчанага пакалення» і інш.) і якія ўжо выявіліся падчас вайны (у запісках М.Гарэцкага «На імперыялістычнай вайне»). Найперш рамантызацыя вайны, упрыгожванне вайскоўцаў яе арэолам: «Военная форма так шла к его темным волосам, бледному лицу ‹…› он носил в себе героизм русской армии» (т. 2, с. 72), а таксама пяшчота апошніх спатканняў жаніха і нявесты, іх кранальнае развітанне, трагедыя заўчасна абарванага маладога жыцця, немагчымасць блізкіх разбурыць прывіднае шчасце дзяўчыны, якая не ведае пра смерць і верыць у сустрэчу з каханым. У гэтым Б. стаў папярэднікам шэрагу адкрыццяў у ваен. тэматыцы, зробленых Э.Хемінгуэем, Э.Рэмаркам і інш. Твор мае падзагаловак «з натуры», што сведчыць пра хуткі водгук аўтара на найноўшыя падзеі, пазначае жанр апавядання-замалёўкі, дзе акрэслены найб. выразныя прыкметы святочнай абстаноўкі, на фоне якіх і ў кантрасце з якімі паведамляецца пра зборы на вайну, пра звесткі з фронту. Другое апавяданне Б. «Страшное», нібы ў працяг папярэдняму, натуралістычна апавядае пра тое, што адбылося (ці магло адбыцца) з маладым чалавекам на фронце.

Упершыню — «Северная газета», 1914. № 232, 21 верас.

*Г.Я.Адамовіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ